Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры
Рэспубліканскі фонд імя братоў Гарэцкіх
Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі
Інстытут геахіміі і геафізікі НАН Беларусі

# МАКСІМ І ГАЎРЫЛА ГАРЭЦКІЯ І ІХ ГРАМАДСКА-КУЛЬТУРНАЕ І НАВУКОВА-ТВОРЧАЕ АСЯРОДДЗЕ

# XV ГАРЭЦКІЯ ЧЫТАННІ

**Матэрыялы чытанняў**
**Мінск, 7 чэрвеня 2007 г.**

Рэпазітарый БарДУ

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў
ІНВ. № 382 784

Мінск
2008

# З М Е С Т

## Пленарнае пасяджэнне

**Лідзія Макарэвіч** (Мінск). Уступнае слова ........................................ 5
**Ніл Гілевіч** (Мінск). Прывітальнае слова ........................................ 6
**Радзім Гарэцкі** (Мінск). Янка Купала, Якуб Колас і браты Гарэцкія ...... 8
**Міхась Кенька** (Мінск). Гарэцказнаўства ў развіцці (па старонках зборнікаў «Гарэцкія чытанні» №№ XII, XIII, XIV) ........................................ 17
**Міхась Мушынскі** (Мінск). Браты Максім і Гаўрыла Гарэцкія і іх асяроддзе. Асвятленне гэтай тэмы ў дакладах на I–XIV канферэнцыях ......25

## Секцыйныя пасяджэнні

**Ванда Бароўка** (Віцебск). Праблема эстэтычнай і нацыянальнай ідэнтычнасці ў літаратурна-крытычных працах Максіма Гарэцкага 20-х гадоў ........................................42
**Алена Белая** (Баранавічы). «Комплекс Праметэя» і праблема самаідэнтыфікацыі героя ў прозе М. Гарэцкага ........................................ 47
**Ірына Гоўзіч** (Мінск). «Малая проза» Максіма Гарэцкага ў кантэксце літаратурнага працэсу XX стагоддзя ........................................ 52
**Ганна Запартыка** (Мінск). Педагагічная дзейнасць Максіма Гарэцкага ў высылцы ........................................ 56
**Генадзь Кажамякін** (Мінск). Максім Гарэцкі і яго творчасць у энцыклапедычных артыкулах ........................................ 60
**Сяргей Клышэвіч** – кіраўнік **Мая Ляўковіч** (Мінск). Максім Гарэцкі і Міхась Чарот: на перакрыжаванні лёсаў ........................................ 66
**Аляксей Кляцкоў** – кіраўнік **Святлана Сацукевіч** (Мінск). Праблема экзістэнцыяльнага суб'екта ў беларускай літаратуры ў кантэксце традыцый еўрапейскага экзістэнцыялізму ........................................ 73
**Ларыса Кныш** (Мінск). Паралінгвістычныя сродкі гутарковай камунікацыі ў мастацкім тэксце (паводле прозы Максіма Гарэцкага) ............ 81
**Сяргей Макарэвіч** (Мінск). Андрэй Сухі – сведка станаўлення асобаў Максіма і Гаўрылы Гарэцкіх ........................................86
**Ганна Навасельцава** (Віцебск). Мастацкае асэнсаванне мінулага ў прозе Максіма Гарэцкага ........................................88
**Святлана Сачанка** (Мінск). Устойлівыя вобразы ў рамане Максіма Гарэцкага «Віленскія камунары» ........................................93
**Ганна Серэхан** (Мінск). Літаратурны «сваяк» братоў Гарэцкіх: асоба і творчасць Антона Гарэцкага ........................................97
**Тамара Тарасава** (Мінск). Максім Гарэцкі «Дзве душы»: канфлікт экзістэнцыяльнага чалавека і сацыяльнай асобы ў адным лёсе ................ 102
**Вольга Уткевіч** (Віцебск). Ідэя ўкаранёнасці ў мастацкім асэнсаванні Максіма Гарэцкага ........................................107
**Алена Шарапа** (Мінск). Навелістычныя традыцыі ў «малой» прозе Максіма Гарэцкага ........................................110
**Нашы аўтары** ........................................114

Репозиторий БарГУ

*Алена Белая*
(Баранавічы)

# «КОМПЛЕКС ПРАМЕТЭЯ» І ПРАБЛЕМА САМАІДЭНТЫФІКАЦЫІ ГЕРОЯ Ў ПРОЗЕ М. ГАРЭЦКАГА

Асвятленне вызначанага даследчага аспекта вымагае папярэдняга каментарыю. Міфы аб Праметэю звязаны з подступамі да гераічнага веку. Гэта час бітвы Зеўса з тытанамі, устанаўлення яго новай улады, стварэння роду чалавечага. Паводле шэрагу крыніц, Праметэй сам вылепіў першых людзей з зямлі і вады, ды яшчэ стварыў іх тымі, хто глядзіць, на ўзор багоў, у неба. Ёсць і ўказанне на тое, што людзей і жывёл багі стварылі ў зямных нетрах з сумесі агню і зямлі, а Праметэй і Эпіметэй павінны былі размеркаваць паміж імі здольнасці. Пра людзей давялося клапаціцца Праметэю. У выглядзе агню, украдзенага ім з майстэрні Гефеста і Афіны, ён дарue чалавеку тэхнічны прагрэс. Паводле Эсхіла, «усе мастацтвы ў людзей ад Праметэя», да таго ж ён надзяліў розумам сляпых, вартых жалю людзей, што жылі, як мурашкі, у пячорах, навучыў іх будаваць дамы і караблі, займацца рамёствамі, насіць адзенне, лічыць, чытаць і пісаць, адрозніваць поры года, прыносіць ахвяры багам і варажыць (у той час, у Гесіода Праметэй – хітры, але добры да людзей падманшчык Зеўса, небеспадстаўна ім пакараны). Эсхілаўскай трылогіі, якая дайшла да нас у выглядзе адной часткі « «Прыкаваны Праметэй» « і асобных фрагментах уласцівы вобраз Праметэя як сімвал чалавечай цывілізацыі. Рымскім аўтарам (у прыватнасці, Гарацыю) увогуле належыць традыцыя асуджальнага паказу Праметэя [5, с. 450–452].

«Комплекс Праметэя», на думку французскага філосафа Г. Башляра, «гэта сукупнасць пабуджэнняў, з прычыны якіх мы імкнёмся параўняцца ў ведах з нашымі бацькамі, а затым перасягнуць іх; дасягнуць узроўню настаўнікаў, а затым перавысіць яго».

«Комплекс Праметэя» – гэта «эдыпаў комплекс» разумовага жыцця, уласцівы асобам больш рэдкага духоўнага складу, а не ўладальнікам моцных інстынктаў, якія выступаюць рухавіком імкнення да першынства [2]. Першапачатковым жа ядром міфа аб Эдыпе даследчыкі лічаць старажытны фальклорны матыў аб змаганні не пазнаўшых адзін аднаго бацькі і сына, у тым яго варыянце, дзе сын перамагае бацьку як маладзейшы і дужэйшы супернік [5, с. 632].

У сваёй працы «Псіхааналіз агню» [2] Башляр абгрунтоўвае праблему апошняга як псіхалагічную. Агонь і цяпло, лічыць вучоны, даюць ключ да разумення самых розных рэчаў, таму што з імі звязаны непазбыўныя ўспаміны, а таксама як працейшы, так і вырашальны вопыт кожнага чалавека.

Рэпазіторый БарДУ

Агонь – выключная з'ява, здольная растлумачыць усё. Калі ўсе паступовыя змены можна растлумачыць самім жыццём, то ўсе імклівыя перамены маюць прычынай агонь, які валодае лішкам жыцця. Агонь – гэта нешта глыбока асабовае і, разам з тым, універсальнае. Ён жыве ў сэрцы. Ён жыве ў нябёсах ... Ён хаваецца ў нетрах матэрыі, тлеючы пад сподам, як затоеная нянавісць і прага помсты. З усіх з'яў ён адзін так відавочна надзелены ўласцівасцю прымаць супрацьлеглыя значэнні – дабра і зла, бо ён – ласка і катаванне, ззянне Раю і пекла Апраметнай. Гэта кухонны ачаг і апакаліпсіс. Ён дае радасць дзіцяці, якое смірна сядзіць ля печы, але ён жа і карае за непаслушэнства таго, хто распачне з ім занадта дзёрзкую гульню. Ён дае асалоду і патрабуе пачцівасці. Агонь таксама лічыцца сімвалам чысціні. Бадай, гэта тая каштоўнасць, якая «ўвекавечыла перавагі поўнага аб'ектыўнага вопыту» [2, с. 118].

Агонь супярэчлівы, і таму гэта адзін з універсальных пачаткаў вытлумачэння свету, сутнасць хутчэй грамадская, чым прыродная. Гэтая з'ява хутка займае сваё месца ў сферы складаных і заблытаных сацыяльных ведаў, бо пачцівыя адносіны да агню не ўласцівы чалавеку ад прыроды, а ўнушаюцца выхаваннем. Адсюль вынікае, што праблема асабістага пазнання агню ёсць праблема спрытнага непадпарадкавання («ловкого неповиновения»). Пераймаючы бацьку, хлопчык крадзе запалкі, уцякае ў поле і на дне яра закладвае асяродак дзіцячай вольніцы.

Матыў, вылучаны Г. Башлярам у працэсе аналізу агню як фенаменалагічнай каштоўнасці, сугучны асобным матывам празаічных твораў М. Гарэцкага. Гэта ў пэўнай ступені пацвярджае выснову вялікага француза аб тым, што філасофія можа спадзявацца на магчымасць «злучыць паэзію і навуку як пару дакладна дастасаваных дэталяў» [2, с. 109], дасягнуць узаемадапаўняльнасці паміж імі. У нашым выпадку гэта датычыць праблемы самаідэнтыфікацыі асобы, якая заўжды актуалізуецца на этапе трансфармацыйных працэсаў у грамадстве.

Праблема нацыянальнай ідэнтычнасці па-мастацку вырашана Гарэцкім у многіх яго творах і даволі грунтоўна даследавана. Нашу ўвагу прыцягнуў наступны эпізод з аповесці «Меланхолія»:

«Дзядзька! Дайце мне запалку, – папрасіў хлопчык.

«Нашто табе? – спытаўся ў яго Лявон.

«Пайду ў лес – вогнішча раскладу».

Лявон зразумеў яго жаданне і палез у кішэню па карабок. Якая любота пайсці на ляда і паміж зарасняў, ля пня, назбіраць трэсак, зладзіць і падпаліць. Наладзіць хворасту, і калі агонь праб'ецца на гару і абхопіць жоўтымі языкамі сучча – легчы тут, грэцца, глядзець, як агонь шугае, ліжа галінкі, дыміць і яснее; і думаць аб восені, ціхім змрочным вечары, доўгай чорнай ночы; успамінаць

Рэпазіторый БарДУ

леташні год. І Лявон ахвотна даў хлопчыку некалькі запалак, бо ён пачуў родны дух ... Абодва яны, і Лявон і хлопчык, былі сыны народу, душа якога праз гісторыю і жыццё на балотных і лесавых абшарах зрабілася падобнай да таго ціханька шугаючага цяпла сярод цемнаватага ціхага восеньскага надвор'я на пустым і адзінокім пакінутым лядзе ...» [4, с. 238].

У кантэксце «псіхааналізу агню» гэты эпізод выяўляе імкненне героя бачыць сябе ў супольнасці свайго народу, а таксама жаданне, кажучы словамі самога М. Гарэцкага, «усведамляць» іншых.

«Кахаць, вучыцца і працаваць дзеля вызвалення Беларусі!» – сказаў сам сабе Лявон Задума...» [4, с. 166], вызначыўшы самыя галоўныя для яго напрамкі самаажыццяўлення, якое, аднак, увогуле было «трудна ... беларускім мужыцкім сынам»: «ці рві з душы роднае карэнне і адракайся роднае хаты, ці ўцякай ад панскай вопраткі і цягайся за прымітыўнаю дзядоўскаю сахою» [4, с. 171]. Відавочна, што праблема статуснай ідэнтыфікацыі інтэлігента – выхадца з вёскі – паўстае для яго найвастрэйшай, хоць па сутнасці гэты «праект» адпавядае яго жыццёвай стратэгіі.

Дарэчным будзе азначэнне інтэлігенцыі, паводле Іванова-Разумніка, як «пазасаслоўнай, пазакласавай, пераемнаснай групы, што характарызуецца творчасцю новых форм і ідэалаў і актыўным іх ажыццяўленнем у кірунку фізічнага і разумовага, грамадскага і асабістага вызвалення асобы» [6, с. 167]. З'яўляючыся прадстаўніком інтэлігенцыі, герой М. Гарэцкага «прэтэндуе на канструяванне новых ідэнтычнасцей і стыляў жыцця» [6, с. 164], аднак яго статусная ідэнтыфікацыя ўскладняецца адсутнасцю ў ёй фактару пераемнасці, а таксама асаблівасцямі яго ментальнай фактуры.

Так, гэта выразна відаць з інтралогу Ігната Абдзіраловіча, які сведчыць пра насычэнне матываў яго асобы змястоўнымі намерамі жыцця. Істотна ў рамках узнятай намі праблемы тое, што і тут агонь выступае, як ужо гаварылася, з'явай, здольнай вытлумачваць усё, а найперш «імклівыя перамены».

«Раней быў ён быццам звонку ад народа, ад сялянскай і работніцкай грамады, пазіраў на рэвалюцыйную завіруху так, як некалі на вялікі пажар у сяле <...>; калі разважаў раней аб усім чыста, што дзеелася каля яго, дык ізноўткі ставіў сябе збоку, воддаль ад народнага няшчасця ... Цяпер жа ... быццам пачуў і сябе тою грамадою, ад якой стаяў раней збоку <...>, хоць і заставаўся яшчэ ў угоду свайму характару толькі пабочным глядзельнікам і ціхім думаннікам» [3, с. 61–62].

Адзін з раздзелаў аповесці «У чым яго крыўда» мае эпіграфам народную прымаўку «Не гарыць, а цьмее ...». Так як агонь ні ў якой рэальнай іпастасі там не прадстаўлены, мы бачым у гэтым знак патрэбнасці героя пазнаваць і дзейнічаць – гэта значыць яго волі да «інтэлектуальнасці» [2, с. 113].

Репозиторий БарГУ

Агонь знаходзіць месца і ў сістэме паказчыкаў ідэнтычнасці творчай асобы. Гэта можна адзначыць ва ўспрыманні Лявонам Задумай адной з карцін ваенных дзеянняў: «Я загледзеўся на прыгожы абраз: ад снараду загарэўся дом ці стог хлеба, дым палавы, а потым чорны, густы, з языкамі полымя, прэцца ўгару к цёмнаму небу» [4, с. 370]. Або: «... Нямецкія снарады бомкаюць дзесь за Вержбаловам, а ляцяць якраз над намі, толькі высока-высока ў небе. Доўга і звонка, ясна, аж прыгожа, як ляцяць ... Сорам за такое харавство і любаванне» [4, с. 405].

Характарызуючы асаблівасці светапогляду інтэлігента, М. Бярдзяеў пісаў: «Ёсць два светаадчуванні: у аснове аднаго ляжыць пачуццё крыўды, у аснове другога – пачуццё віны, ім адпавядаюць і розныя філасофіі». Філасофія крыўды, на яго думку, «філасофія рабская. Філасофія віны – філасофія свабоды». «Толькі свабодны можа адчуваць сябе вінаватым, толькі той, хто ўсвядоміў віну, звяртаецца да найглыбейшай сваёй свабоды»[6, с. 170].

У жыццёвай філасофіі герояў Гарэцкага адчуванне сораму і віны – адна з генеральных дамінант, што яскрава сведчыць пра характар і напрамак іх самаідэнтыфікацыі. «Сэрца заныла ад убоства роднага месца і ад сустрэчы з роднымі» [4, с. 217]. «Яны мяне з такою радасцю чакалі, а не прынёс я ім весялосці ў хату. Так, мала смеху ў нашай хаце. І я ў тым нямала вінават» [4, с. 429].

Паказальна, што каханне выступае стымулам набыцця героем разнастайнай ідэнтычнасці: «Кніжкі то чытаю. Але і на ігрышчы пайду, і ў царкву ... хоць бы для пацехі бацьком з'езджу; і ў дровы з татам ... паеду ... Толькі тата троху не разумее мяне. Ну, нічога: яшчэ болей папраўлюся, як паеду ... на Вялікдзень, і тата зразумее, што я новы, што я іншы, што я лепшы» [4, с. 171], – піша ў лісце да сябра Лявон Задума. Трэба сказаць, што «комплекс Праметэя» як «эдыпаў комплекс інтэлектуальнага жыцця» паўстае ў прозе М. Гарэцкага досыць выразна, калі мець на ўвазе матыў маральнага і інтэлектуальнага супрацьстаяння сына і бацькі (асабліва «на фоне» маці). «Бацька наогул не казачнік, а калі што і раскажа, дык надта проста, так, як усё дзеецца наўкола ... А маці ўмее заляцець думкаю ў залатую старонку ... і пачынае плясці свае доўгія і цікавыя пляткі... Супакой і нерухомасць распаўзаюцца па хаце» [4, с. 225], – чытаем у аповесці «Меланхолія». Паказальны і такі выраз з твора: «Бацька думаў сваё, Лявон сваё, а матка думала аб сыне».

«Інтэлект жанчын, – піша Ніцшэ, – характарызуецца паўнейшым валоданнем сабой, прысутнасцю духу, выкарыстаннем усіх выгод. Яны перадаюць яго як сваю асноўную якасць у спадчыну сваім дзецям, а бацька далучае да яго больш цёмны фон волі. Яго ўплыў як бы вызначае рытм і гармонію, у якіх павінна разыгрывацца новае жыццё, мелодыя якога, аднак жа, зыходзіць ад жанчыны ... Жан-

Рэпазіторый БарДУ

чынам належыць розум, мужчынам – склад душы і пачуццё (страсць)». М. Гарэцкі з'яўляецца адным з беларускіх пісьменнікаў, які пацвярджае гэтыя высновы адметнасцю сваёй асобы і творчасцю. Героі, якім ён аддаў частку сваёй біяграфіі, бачаць непрыгляднасць асобных сваіх душэўных рухаў ці ўчынкаў на гэтым «цёмным фоне», але вынік супрацьстаяння яму не заўсёды суцяшальны для іх [1].

Такім чынам, праблема самаідэнтыфікацыі героя прозы М. Гарэцкага як асобы нацыянальна свядомай, творчай, інтэлектуальнай выражаецца аўтарам пры дапамозе разнастайных моўна-выяўленчых і кампазіцыйных сродкаў. Сярод іх асобнай увагі заслугоўвае вобраз агню, асацыятыўна і сэнсава звязаны з такім філасофска-псіхалагічным і эстэтычным феноменам, як «комплекс Праметэя», які, у сваю чаргу, выступае сімвалам чалавечай цывілізацыі, прагрэсу, інтэлігентнасці.

### Літаратура


1. Белая А.І. Некаторыя рысы жаночай адметнасці ў філасофіі і літаратуры / Таленавітыя жанчыны Беларусі ў культурнай, навуковай і мастацкай прасторы свету: зборнік матэрыялаў Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Мазыр, 24–25 мая 2007 г. / адказны рэдактар А.У. Сузько; УА МДПУ імя І.П. Шамякіна. – Мазыр: УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, 2007. – С. 222.

2. Башляр Г. Психоанализ огня // Всемирная философия. XX век / Авт.-сост. А.П.Андриевский. – Мн.: Харвест, 2004. – С. 106–118.

3. Гарэцкі М. Дзве душы; Панская сучка: Аповесці; Вясна; Рускі: Апавяданні / М. Гарэцкі. Вязьмо: Раман / М. Зарэцкі. – Мінск: Юнацтва, 1992. – С. 3–107.

4. Гарэцкі М. Прысады жыцця: апавяданні, аповесці / М. Гарэцкі; уклад. Т. Голуб. – Мінск: Маст. літ., 2003. – С. 313–433.

5. Мифологический словарь / Гл. ред. Е.М. Мелетинский. – М.: Сов. Энциклопедия, 1991. – 736 с.

6. Проблемы религиозно-культурной идентичности в русской мысли XIX–XX веков: современное прочтение: Учеб.-метод. пособие / Автор-сост. Г.Я. Миненков. – Минск: БГУ, 2003. – 656 с.


Рэпазіторый БарДУ